УДК 37.012

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСНОВЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЫЯГНОСТЫКІ Ў ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ

**Савіцкая І. У., канд. філал. навук, дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: у артыкуле апісаны і прааналізаваны некаторыя метады педагагічнай дыягностыкі, вызначаны значэнне і роля кожнага з іх у вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Ключавыя словы: вучэбна-выхаваўчы працэс, педагагічная дыягностыка, педагагічная дзейнасць, метады дыягностыкі.

# METHODOLOGICAL BASICS OF ORGANIZATION OF PEDAGOGICAL DIAGNOSTICS IN EDUCATIONAL PROCESS

**Savitskaya I. V., associate professor**
*Belarusian National Technological University*
*Minsk, Republic of Belarus*

Summary: the article describes and analyzes some methods of pedagogical diagnostics, defines the meaning and role of each of them in the educational process.

Key words: educational process, pedagogical diagnostics, pedagogical activities, diagnostic methods.

Дасканалае вывучэнне дзіцяці дазваляе прасачыць дынаміку развіцця асобы ў працэсе выхавання і навучання, планаваць і мэтазгодна накіроўваць работу педагога (класнага кіраўніка, куратара студэнцкай групы, педагога-арганізатара), паколькі ен павінен не толькі сачыць за станам працякання адукацыйнага працэсу ў навучальнай установе, але і рэалізоўваць аналітыка-дыягнастычную функцыю, г.зн. выяўляць узровень адукаванасці і выхаванасці вучня (студэнта). У гэтым яму могуць дапамагчы розныя метады педагагічнай дыягностыкі.

Як вядома, самым распаўсюджаным і шырокаўжывальным метадам з’яўляецца назіранне – мэтанакіраваны і планамерны збор

інфармацыі з наступнай сістэматызацыяй фактаў і фармулеўкай вывадаў. Сучасныя даследчыкі адзначаюць, што назіранне з'яўляецца дастаткова надзейным метадам, які не патрабуе спецыяльнага абсталявання і выключае дадатковую псіхаэмацыйную нагрузку на чалавека. Разам з тым выкарыстанне гэтага метаду прадугледжвае наяўнасць у педагога высокага ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі і глыбокага ведання асаблівасцей навучэнцаў.

Да правядзення псіхолага-педагагічнага назірання існуюць пэўныя патрабаванні. Да іх можна аднесці наступныя: 1) назіранне павінна мець пэўную мэту; 2) яно павінна праходзіць па загадзя выпрацаваным плане; 3) колькасць даследуемых прыкмет павінна быць мінімальнай і канкрэтна вызначанай; 4) псіхолага-педагагічныя з'явы неабходна назіраць у натуральных умовах; 5) звесткі, якія атрымліваюцца шляхам розных назіранняў, павінны быць супастаўляльнымі: з прымяненнем аднолькавых крытэрыяў, дадзеных, атрыманых праз аднолькавыя прамежкі часу, у адных і тых жа ацэнках і інш. [1, с. 29].

Разам з тым істотнымі недахопамі метаду назірання, на наш погляд, з'яўляецца яго дастаткова вялікая працягласць у часе, суб'ектыўнасць ацэнак, а таксама немагчымасць статыстычнай апрацоўкі вынікаў даследавання.

Вельмі часта ў педагагічнай дзейнасці выкарыстоўваецца гутарка, у ходзе якой педагог можа атрымаць неабходную інфармацыю аб асаблівасцях развіцця навучэнца ў выніку іх абмеркавання з іншымі выкладчыкамі, бацькамі або самімі дзецьмі. Мэта гутаркі – абмен думкамі аб развіцці вучня або студэнта, абмеркаванне характару, ступені і магчымых прычын тых праблем, з якімі сутыкаюцца бацькі і педагогі ў працэсе выхавання. Тэмы гутарак могуць быць наступнымі: *"Мае інтарэсы"* (дапамагае даведацца пра захапленні і схільнасці навучэнцаў), *"Матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці"* (дапамагае вызначыць узровень маральнага выхавання навучэнцаў), *"Культура зносін"* (дапамагае вызначыць узровень камунікацыйнай выхаванасці навучэнцаў).

Адным з метадаў педагагічнай дыягностыкі з'яўляецца апытанне ў форме інтэрв'ю. Яно адрозніваецца ад гутаркі наяўнасцю папярэдняй фазы планавання, неабходнай як для высвятлення дыягнастычнай мэты, так і для вядзення самой гутаркі. Пад інтэрв'ю разумеюцца "планамерныя дзеянні з пэўнай навуковай мэтай, у ходзе

якіх падыспытны павінен быць падштурхнуты да паведамлення пэўнай інфармацыі з дапамогай шэрагу мэтавых пытанняў ці вербальных стымулаў" [2, с. 138].

Пры правядзенні інтэрв'ю, на наш погляд, неабходна стварыць атмасферу сімпатыі і ўзаемнага даверу, застаючыся пры гэтым абсалютна натуральным, шчырым і зацікаўленым. Пры гэтым педагог па магчымасці павінен займаць нейтральную пазіцыю, паколькі яго задача не ў тым, каб навучыць чамусьці, а ў тым, каб атрымаць неабходную інфармацыю.

У вучэбна-выхаваўчым працэсе выкарыстоўваецца таксама пісьмовае апытанне, пры якім можна атрымаць звесткі аб аб'ектыўных дадзеных або суб'ектыўных меркаваннях пры дапамозе анкет і тэстаў. У наш час вялікай папулярнасцю карыстаюцца метады, якія прапаноўвае індывідуальна-арыентаваная сістэма, напрыклад, тэсты *"Ці ўмею я? "*, *"Якімі якасцямі асобы я валодаю?"*, *"Паспяховасць арганізацыі вучэбнай дзейнасці ў навучальнай установе"* і інш.

Такім чынам, метады апытання даюць даследчыку магчымасць самому атрымаць інфармацыю ад канкрэтнага чалавека (вучня, слухача, студэнта) як пра факты, якія яго цікавяць, так і аб пазіцыях, інтарэсах, ацэнках рэспандэнта. Усім разгледжаным метадам апытання ўласціва тое, што "рэспандэнт пры дапамозе вусных або пісьмовых пытанняў або сцверджанняў, пры дапамозе невербальных раздражняльнікаў (напрыклад, малюнкаў) павінен быць падштурхнуты да вербальных рэакцый, якія ўтрымліваюць інфармацыю па запланаванай праблематыцы" [3, с. 204–205].

Існуе таксама біяграфічны метад, прадмет даследавання якога – жыццевы шлях чалавека, у працэсе каторага фарміруецца асоба, адбываецца складаны працэс фарміравання гатоўнасці да выканання разнастайных грамадскіх абавязкаў, выпрацоўка індывідуальных каштоўнасцей, светапогляду, характару і здольнасцей чалавека. Асноўнымі крыніцамі біяграфічных звестак з'яўляюцца афіцыйныя біяграфічныя дакументы (напрыклад, характарыстыкі, аўтабіяграфіі), а таксама практычныя вынікі дзейнасці (актыўнасць у грамадскай дзейнасці, паспяховасць у выкананні розных нарматываў і заданняў, удзел у алімпіядах, выставах, студэнцкіх канферэнцыях і да т. п.).

Асноўнымі напрамкамі інтэрпрэтацыі біяграфічнага матэрыялу з'яўляюцца вызначэнне фактараў развіцця канкрэтнага чалавека (асяроддзя развіцця, дзейнасці і г. д.); вызначэнне індывідуальных фаз жыццевага шляху; аналіз структуры фактараў у кожнай фазе, у кожным перыядзе; выяўленне сувязяў паміж фазамі індывідуальнага развіцця.

Распаўсюджаным метадам пры правядзенні педагагічнай дыягностыкі з'яўляецца метад эксперыменту, пад якім разумеецца збор фактаў у спецыяльна створаных умовах, якія забяспечваюць актыўнае праяўленне аналізуемых з'яў. Безумоўна, эксперымент ажыццяўляецца пры дапамозе спецыяльна падабраных эксперыментальных методык; іх выбар і колькасць вызначаюцца задачай, якую неабходна вырашыць даследчыку з абавязковым улікам патрабаванняў па арганізацыі і правядзенні эксперыментальнага вывучэння развіцця асобы, а таксама ўзроўню яе адукаванасці і выхаванасці.

Такім чынам, дыягностыка ў сістэме арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу адыгрывае важную ролю. Яшчэ вялікія педагогі мінулага падкрэслівалі, што неабходна ведаць дзіця, яго асаблівасці характару і схільнасці, каб знайсці з ім агульную мову, знайсці правільныя метады, якія б падыходзілі для работы з тым ці іншым навучэнцам, а таксама з калектывам у цэлым. У гэтым, на нашу думку, і есць сутнасць арганізацыі педагагічнай дыягностыкі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Барытка Н. М. Дыягнастычная дзейнасць педагога: навучальны дапаможнік / Н. М. Барытка. – М. : Акадэмія, 2006. – 284 с.

2. Максімаў В. Г. Педагагічная дыягностыка ў школе: вучэб. дапаможнік / В. Г. Максімаў. – М. : Акадэмія, 2002. – 272 с.

3. Аўсяннікава С. К. Педагагічная дыягностыка і карэкцыя ў выхаваўчым працэсе: вучэбна-метадычны дапаможнік / С. К. Аўсяннікава. – Ніжневартаўск : выд-ць НДДУ, 2011. – 243 с.